## ХОДЗІЦЬ ЛЕТА ПА ПАЛЯХ, ПА РАСКВЕЧАНЫХ ЛУГАХ *(Ніна Галіноўская)*



— Лянок, а ты ўпэўнены, што зараз можна лавіць рыбу? — кпіла Васілінка з Лянка.

— Канечне, можна, я ў таты запытаўся. Ён ведае дакладна, — адказаў Лянок. — А ты, Васілінка, што робіш? — не адрываючы позірку ад паплаўка, запытаўся Лянок.

— Збіраю лекавыя расліны: трыпутнік, рамонак... а вось трапіўся зверабой, — адказала Васілінка.

Якія расліны збіраеце вы, калі бываеце на прыродзе? Чаму не заўсёды яны доўга радуюць нас сваёй прыгажосцю?



# Слёзы лілеі

*Фама Рамашка*

Цёплы ліпеньскі дзень. Свеціць яркае сонейка. Святланка прыйшла на рэчку. Падабаецца ёй сядзець на беразе,назіраць, як кружаць над беласнежнымі лілеямі сінякрылыя стракозы.

— На вось, мой падарунак, — падышоў да яе незнаёмы хлопчык і падаў некалькі лілéй.

— Не трэба было іх ірваць! — сказала дзяўчынка.

— Знайшла што шкадаваць, — сказаў хлопчык. — Вунь колькі іх у рэчцы!

— Без іх жа стане зусім сумна і мне, і стракозам. Ды і сонейку таксама.

— Як, сонейку? — здзівіўся хлопчык.

Зразумела Святланка, што хлопчык нічога не ведае пра рачны́х прыгажунь.

— Калі свеціць сонейка — цвітуць і лілеі. Дораць усім сваю прыгажосць. І матылькам, і стракозам. Усім, хто бывае тут, — растлумáчвала дзяўчынка. — А пойдзе дождж — яны згортваюць свае белыя пя-

лёсткі і знікаюць пад вадой. Чакаюць, пакуль сонейка не з’я́віцца зноў. Сумна тады на рэчцы...

Слухаў хлопчык дзяўчынку, а побач на траве ляжалі завялыя лілеі. З белых пялёсткаў сцякалі чыстыя кропелькі рачной вады. Хлопчыку здавалася, што гэта слёзы лілеі.

1. Якія пачуцці выклікаў у вас твор?
2. Знайдзіце і прачытайце радкі, якія характарызуюць Святланку як назіральную, добрую, клапатлівую дзяўчынку.
3. Што прынёс Святланцы хлопчык у падарунак? Ці парадавала гэта дзяўчынку? Чаму?
4. Як вы зразумелі галоўную думку твора?
5. Навучыцеся чытаць апавяданне па ролях.

Адгадайце загадку.




Я ў людзей шмат не бяру,
Болей радасць ім дару.
Я твой сябра ва ўсе часіны года.
Хто ж такая? Родная ... .

*Мікола Чарняўскі.*

Як вы думаеце, што значыць быць уважлівым да прыроды чалавекам? Паразважайце, як людзі павінны адносіцца да прыроды. Як патрэбна паводзіць сябе ў лесе, парку, каля ракі?

Калектыўна прыдумайце правілы паводзін чалавека ў прыродзе. Пачніце так: *«Выхаваны чалавек ніколі не ..., таму што ...».*

Прачытайце пачатак апавядання «Слёзы лілеі» яшчэ раз і складзіце свой працяг твора.

**Пры́зба** — невысокі, звычайна земляны насып уздоўж сцяны хаты, зроблены для ўцяплення памяшкання.

## Гутарка асоту з крапівою

— Што ты раўняешся са мною? — крычала крапіва асоту. — Нічога ты не робіш; ніхто цябе не ведае; расцеш недзе ў полі сярод аўсоў. Вось я так увіха́юся: таго крапіва пацалуе, хто крапіву згатуе. Кожны крапіву ведае, кожны ўспамінае, на кожным пад-

ворку расту я. Глядзі, ужо аж да прызбаў падпаўзла.

— Як жа, — адазваўся стары асот, — я расту далей, бачаць мяне людзі радзе́й, але, му́сіць, мае шпількі дык даўжэй помняць ад крапіўкі.



Якраз на той час падслухала іх гутарку малая Мару́та і кажа:

— Не хваліцеся: абое вы рабое! Матулька казала, што вас абодвух з карэннем выдзера.

*Паводле Цёткі.*

1. Чым хваліліся крапіва і асот?
2. Што сказала асоту і крапіве Марута?
3. Як вы разумееце выраз *абое вы рабое*?
4. Паразважайце, людзей якога характару аўтар мае на ўвазе пад вобразамі асоту і крапівы.
5. Якая галоўная думка казкі?